*УДК 372.8:373.1.02*

# ФАРМІРАВАННЕ КАШТОЎНАСНЫХ АРЫЕНТАЦЫЙ НАВУЧЭНЦАЎ У ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

**Г. М. Валочка[1)], В. У. Зелянка[2)]**

*[1)] Нацыянальны інстытут адукацыі,*
*вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск, Беларусь, h.valochka@mail.ru*
*[2)] Нацыянальны інстытут адукацыі,*
*вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск, Беларусь, zelenko7373@mail.ru*

У артыкуле разглядаюцца каштоўнасныя арыентацыі як адна з базісных характарыстык асобы, што прадвызначаюць учынкі і дзеянні чалавека, і роля вучэбнага прадмета «Беларуская мова» ў іх фарміраванні. Адзначаецца, што беларуская мова з'яўляецца ўніверсальным сродкам далучэння чалавека да культуры як сістэмы каштоўнасцей і норм паводзін, культурна-гістарычным асяроддзем, якое фарміруе адукаваную, высокамаральную асобу. Аналізуюцца метады і прыёмы, якія дапамагаюць навучэнцам авалодаць беларускай мовай як сістэмай захавання і перадачы каштоўнасцей культуры, як сродкам спасціжэння айчыннай і сусветнай культуры, нормамі маўленчага этыкету і правіламі сацыяльных паводзін.

***Ключавыя словы:*** каштоўнасныя арыентацыі; беларуская мова; узаемазвязанае вывучэнне мовы і культуры.

# FORMATION OF VALUE ORIENTATIONS OF STUDENTS WHEN TEACHING THE BELARUSIAN LANGUAGE

**H. M. Valochka[a)], V. U. Zelianko[b)]**

*[a)] National Institute of Education,*
*Korolia St., 4, 220004, Minsk, Belarus, h.valochka @mail.ru*
*[b)] National Institute of Education,*
*Korolia St., 4, 220004, Minsk, Belarus, zelenko7373@mail.ru*

The article examines value orientations as one of the basic characteristics of a person that predetermine human actions and deeds, as well as the role of the academic subject of the Belarusian language in their formation. It is noted that the Belarusian language is a universal means of introducing a person to culture as a system of values and norms of behavior, the cultural and historical environment that forms an educated, highly moral personality. Methods and techniques analyzed in the article help students to master the Belarusian language as a system for preserving and transmitting cultural values, as well as a means of comprehending national and world culture, norms of speech etiquette and rules of social behavior.

***Key words:*** value orientations; Belarusian language; interrelated learning of language and culture.

Каштоўнасныя арыентацыі – гэта выбіральнае стаўленне чалавека да матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, сістэма яго ўстановак, перакананняў, прыхільнасцей, выражаная ў свядомасці і паводзінах; спосаб дыферэнцыяцыі чалавекам аб'ектаў па іх значнасці [1].

Нягледзячы на розныя погляды даследчыкаў на праблему каштоўнасцей, усе яны ў той ці іншай ступені канстатуюць, што сістэма

каштоўнасцей – гэта істотны аспект асобы, які вызначае яе светапогляд. Каштоўнасці ўплываюць на ўяўленні чалавека пра самога сябе, успрыманне ім навакольнага свету. Каштоўнасныя арыентацыі вызначаюць паводзіны чалавека, яго ўнутраную гатоўнасць да ажыццяўлення той ці іншай дзейнасці для дасягнення вызначаных мэт і задавальнення сваіх патрэб. Іншымі словамі, менавіта каштоўнасныя арыентацыі, якія з’яўляюцца адной з базісных характарыстык асобы, прадвызначаюць учынкі і дзеянні чалавека.

Каштоўнасныя арыентацыі – складанае ўтварэнне, у якім вучоныя выдзяляюць тры асноўныя кампаненты: кагнітыўны (веды), эматыўны (эмацыянальны складнік) і паводзінскі (звязаны з рэалізацыяй каштоўнасных арыентацый у паводзінах асобы).

Вядома, што каштоўнасныя арыентацыі з’яўляюцца характарыстыкай сталай, сфарміраванай асобы, іх сістэма ўплывае на матывацыю, вызначае паводзіны чалавека ў грамадстве.

Важнасць каштоўнаснага складніка ў фарміраванні асобы навучэнца падкрэсліваецца ў адукацыйным стандарце сярэдняй адукацыі [2]. Напрыклад, прагназуецца, што выпускнік агульнай сярэдняй адукацыі – гэта навучэнец, які свядома прымае агульначалавечыя і нацыянальныя духоўна-маральныя каштоўнасці; любіць Беларусь, паважае народ, які жыве ў ёй, яго культуру, традыцыі, гісторыю; валодае дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь; захоўвае сямейныя каштоўнасці; усведамляе сябе грамадзянінам беларускай дзяржавы; жыве паводле прынятых у грамадстве прававых і маральна-этычных норм, валодае пачуццём абавязку і адказнасці перад членамі сям’і, грамадствам і дзяржавай; праяўляе талерантнасць да людзей; здольны і гатовы да сацыяльнага самавызначэння; разумее каштоўнасць адукацыі і навукі; усведамляе адказнасць перад грамадствам за экалагічную бяспеку навакольнага свету; свядома кіруецца правіламі здаровага ладу жыцця; здольны да супрацоўніцтва і камунікацыі ў розных сітуацыях і ўмовах.

Аднак, калі, напрыклад, разглядаць месца нацыянальна-культурных каштоўнасцей у іерархіі каштоўнасных арыентацый вучняў, то, як паказалі вынікі вывучэння асобаснага развіцця навучэнцаў, якое праводзіцца штогод упраўленнем маніторынгу якасці адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі (2019/2020 навучальны год), веданне нацыянальнай культуры ў якасці значнай для сябе каштоўнасці вылучылі 36 % апытаных (у пераліку каштоўнасных арыентацый – дзявятае месца з адзінаццаці пазіцый) [3].

Нават гэты прыклад паказвае, наколькі справядлівае выказванне філосафа і педагога С. І. Гесэна: «Мэты адукацыі – гэта культурныя

каштоўнасці, да якіх у працэсе адукацыі павінен быць далучаны чалавек» [4].

Беларуская мова як прадмет духоўны, светапоглядны закліканы забяспечваць не толькі фарміраванне моўных, маўленчых, камунікатыўных ведаў, уменняў і навыкаў вучняў, але і выхаванне пачуцця патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці, выпрацоўку каштоўнасных арыенціраў, далучэнне да духоўных багаццяў, якія захаваліся ў мове, спасціжэнне нацыянальнай і сусветнай культуры.

Неад'емнай часткай культуры асобы з'яўляюцца каштоўнасныя адносіны да роднай мовы, пад якімі разумеюць унутраную пазіцыю носьбіта мовы, заснаваную на ўсведамленні мовы як фундаментальнай каштоўнасці нацыянальнай культуры, што знаходзіць адбітак у гатоўнасці асобы спасцігаць мову ва ўсіх яе функцыях і імкненні да ўдасканалення маўленчай культуры.

Моўнымі ідэямі, што «пераводзяць мову ў светапоглядную плоскасць, робяць яе эстэтычнай і маральнай каштоўнасцю для любога носьбіта мовы» [5, с. 17], паводле Н. А. Смятнёвай, выступаюць уяўленні пра мову як шматаспектную і шматфункцыянальную з'яву (мова – сродак зносін, інструмент пазнання, частка нацыянальнай духоўнай культуры, гістарычна абумоўленая з'ява і г. д.).

Да вынікаў засваення зместу вучэбнага прадмета «Беларуская мова», акрэсленых адукацыйным стандартам, адносіцца авалоданне вучнямі мовай як сістэмай захавання і перадачы каштоўнасцей культуры, як сродкам спасціжэння айчыннай і сусветнай культуры, нормамі маўленчага этыкету і правіламі сацыяльных паводзін. Рэалізацыю ўказаных патрабаванняў забяспечваюць лінгвакультуралагічны і сацыякультурны падыходы да навучання беларускай мове, якія арыентуюць на ўзаемазвязанае вывучэнне мовы і культуры, у выніку чаго вучні не толькі засвойваюць культуразнаўчую інфармацыю, але і набываюць уменні карыстацца ёю з мэтай забеспячэння паўнацэннай камунікацыі, фарміруюць уласнае культурнае аблічча.

У сучаснай лінгваметодыцы вылучаюць ***тры напрамкі*** ўзаемазвязанага вывучэння мовы і культуры:

1) засваенне вучнямі нацыянальна маркіраваных адзінак беларускай мовы (патрабуе спецыяльнай увагі да вывучэння слоў, фразеалагізмаў, устойлівых параўнанняў, прыказак і прымавак, якія перадаюць адметнасць беларускай моўнай карціны свету);

2) спасціжэнне каштоўнасцей і рэалій нацыянальнай культуры (прадугледжвае аналіз афарыстычных выказванняў, што належаць выдатным стваральнікам айчыннай культуры, а таксама

культуразнаўчых тэкстаў, на аснове зместу якіх адбываецца асэнсаванне вучнямі культурнага вопыту беларускага народа);

3) навучанне беларускай мове ў дыялогу культур (фарміруе ў вучняў уяўленне пра самабытнасць і ўнікальнасць беларускай мовы і культуры на фоне іх супастаўлення з мовамі і культурамі іншых народаў, спрыяе выхаванню павагі да носьбітаў іншых моў, культурных каштоўнасцей народаў свету).

Фарміраванне каштоўнасных арыентацый навучэнцаў у працэсе навучання беларускай мове забяспечваюць пэўныя ***метады і прыёмы навучання***, напрыклад:

- лінгвакультуралагічнае паведамленне настаўніка (мэта – растлумачыць паходжанне і семантыку нацыянальна маркіраваных моўных адзінак, раскрыць культурны фон, які стаіць за імі, паказаць нацыянальную спецыфіку маўленчых паводзін і пад.);
- экстралінгвістычны каментарый (можа змяшчаць інфармацыю пра функцыю пэўнага прадмета матэрыяльнай культуры, спецыфічныя рысы нацыянальнага характару, народныя звычаі і традыцыі, гістарычныя і культурныя падзеі і пад.);
- лінгвакультуралагічны аналіз нацыянальна маркіраваных моўных адзінак, звязаны з выяўленнем іх канататыўных і сімвалічных значэнняў, высвятленнем этымалогіі і раскрыццём унутранай формы слоў, фразеалагізмаў, прыказак, прымавак, параўнанняў (напрыклад, фразеалагізм *адрабляць шарварку* ўзнік у выніку пераасэнсавання свабоднага словазлучэння: устарэлы назоўнік *шарварка* абазначаў грамадскую працоўную павіннасць па будаўніцтве і рамонце дарог, мастоў, грэбляў; гэта павіннасць адраблялася прымусова і, зразумела, без асаблівай ахвоты, што і стала асновай для ўзнікнення фразеалагізма [6, с. 101]);
- складанне асацыятыўных палёў са словам, фразеалагізмам, паходжанне і існаванне якіх звязана з гісторыяй, культурай, псіхалогіяй беларускага народа (да пэўнага слова-стымулу вучні ўказваюць асацыяцыі (словы розных часцін мовы, фразеалагізмы) і тлумачаць, чым яны выкліканы);
- лінгвакультуралагічная «расшыфроўка» культуразнаўчых тэкстаў, у якіх раскрываюцца факты духоўнай і матэрыяльнай культуры беларускага народа: традыцыі, мараль, побыт, жыццёвая філасофія, каштоўнасці, нацыянальныя сімвалы і інш.;
- рэканструкцыя лінгвакультуразнаўчых тэкстаў (устаўка ў тэкст прапушчаных слоў, параўнанняў, этыкетных формул і інш.);

- падбор беларускіх адпаведнікаў да рускамоўных фразеалагізмаў, прыказак, формул маўленчага этыкету (рус. *клевать носом* – бел. *вадзіць дзяды*; рус. *Первый блин комом* – бел. *Першае цялятка – шчанятка*; рус. *как дела?* – бел. *як маешся?*);
- устанаўленне адпаведнасці паміж іншамоўнымі словамі і назвамі краін, культуру якіх яны характарызуюць (*ікебана* – Японія, *карыда* – Іспанія, *чардаш* – Венгрыя, *сары* – Індыя, *лезгінка* – Грузія);
- назіранне за адметнасцю ўнутранай формы беларускіх слоў і іх адпаведнікаў у блізкароднасных і неблізкароднасных мовах (бел. *конік* (нагадвае маленькага каня) – рус. *кузнечик* (у аснове назвы – гукі «песні» гэтага насякомага));
- складанне слоўнікавых артыкулаў лінгвакультуралагічнага характару, у якіх адлюстроўваецца культуразнаўчная інфармацыя, «закадзіраваная» ў моўных адзінках;
- вусныя і пісьмовыя выказванні вучняў на этналінгвістычныя, лінгвакультуралагічныя, сацыякультурныя тэмы і інш.

Дзейсным сродкам фарміравання ў вучняў каштоўнасных адносін да роднай мовы з’яўляюцца выказванні выдатных асоб – філосафаў, пісьменнікаў, вучоных, дзеячаў мастацтва, педагогаў і інш.: «Яно добра, а нават і трэба знаць суседскую мову, але найперш трэба знаць сваю» (Ф. Багушэвіч); «Адкрываю, як свет, нанова беларускае роднае слова» (А. Канапелька); «Якой бы музыкай гучала наша слова, калі б умелі слова шанаваць» (Я. Непачаловіч) і інш. У афарызмах знаходзяць адбітак, з аднаго боку, грамадскія культурныя ідэалы (адносіны грамадства ў цэлым або пэўнай яго часткі да мовы), з другога боку – прыярытэтныя індывідуальныя каштоўнасці аўтараў выслоўяў. Заўважым, што большасць афарыстычных думак пра мову належыць знакамітым літаратарам, або «ўзорным моўным асобам», паводле Г. І. Богіна. А зносіны з пісьменнікамі праз створаныя імі тэксты (у тым ліку і выказванні пра мову) Г. І. Богін справядліва лічыў найбольш павучальнай формай камунікацыі [7, с. 14].

Афарыстычныя выслоўі пра беларускую мову могуць быць выкарыстаны ў працэсе навучання ў якасці:

- практычнага матэрыялу для замацавання ведаў, фарміравання ўменняў і навыкаў па пэўнай тэме;
- ілюстрацыйнага матэрыялу, які пацвярджае пэўныя палажэнні лінгвістычнай тэорыі;
- тэзісаў, для доказу якіх патрабуецца спаслацца на канкрэтныя моўныя факты;

- тэм для стварэння вучнямі ўласных выказванняў розных жанраў;
- крыніцы звестак пра асобу аўтара выказвання і інш.

Такім чынам, выкарыстанне ў адукацыйным працэсе спецыяльных метадаў і прыёмаў навучання, зварот да выказванняў дзеячаў культуры пра ролю роднай мовы ў жыцці этнасу і асобнага чалавека садзейнічае фарміраванню ў вучняў каштоўнасных адносін да мовы як феномена культуры, у якім знайшлі адбітак яе праяўленні, развіццю сродкамі мовы інтэлектуальнай, камунікатыўнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай культуры навучэнцаў.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Коджаспирова Г. М., Коджаспиров А. Ю.* Педагогический словарь. 2-е изд., стер. М. : AcademiA, 2005.

2. Адукацыйны стандарт сярэдняй адукацыі [Электронны рэсурс]. // URL https://adu.by/images/2019/01/obr-standarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf (дата звяртання 22.04.2021).

3. Рекомендации по результатам изучения личностного развития учащихся (2019/2020 учебный год) // Веснік адукацыі. 2020. №9. С. 5–14.

4. *Гессен С. И.* Основы педагогики. Введение в прикладную философию. М. : Школа-Пресс, 1995.

5. *Сметнева Н. А.* Способы выражения ценностного отношения к русскому языку в речи учителя // Русский язык в школе. 2006. № 3. С. 16–22.

6. *Лепешаў І. Я.* Чаму мы так гаворым : даведнік. Гродна : ГрДУ, 2003.

7. *Богин Г. И.* Современная лингводидактика: учеб. пособие. Калинин : Калининский гос. ун-т, 1980.